# АКЦЫЯ ДА ДНЯ КАНСТЫТУЦЫІ

Да Дня Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь была праведзена гарадская акцыя «Праз дыялог моў – да душы, да сэрца». Напачатку перад прысутнымі выступілі артысты Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа з фрагментам спектакля «Конскі партрэт» і ўдзельнікі літаратурнай гасцёўні філалагічнага факультэта ўніверсітэта «Строкой негромкою...», якой, дарэчы, сёлета споўнілася 20 год. Але галоўнай падзеяй мерапрыемства стала правядзенне гарадскіх дыктовак па рускай і беларускай мовах, у якіх змаглі прыняць удзел усе ахвотныя. У выніку 38 чалавек пісалі дыктоўку па беларускай мове і 54 (у пераважнай большасці гэта студэнты факультэта навучання замежных грамадзян) – па рускай. З вынікамі дыктоўкі можна пазнаёміцца на сайце нашага ўніверсітэта.